# ГЕАЛАКАЦЫЯ ДЛЯ КРАІНЫ

## Кожны зможа ўбачыць, як мы рухаемся да пастаўленых мэт

**Каб ведаць, з якой хуткасцю і куды едзе аўтамабіль, патрэбны адпаведныя прыборы і сувязь са спадарожнікамі ў космасе. Тое, як да дасягнення Мэт устойлівага развіцця рухаецца ўвесь свет, можна будзе адсочваць па 232 глабальных паказчыках, якія вызначаны ААН. Ацаніць, з якой хуткасцю па гэтым шляху рухаецца Беларусь, дазволіць адпаведная сістэма маніторынгу. Нацыянальны пералік з 255 паказчыкаў ужо падрыхтаваны, з іх 140 цалкам адпавядаюць глабальным.**

Беларускі статыстычны камітэт на першым Нацыянальным форуме па ўстойлівым развіцці прэзентаваў Нацыянальную платформу справаздачнасці па Мэтах устойлівага развіцця. Гэта платформа дазволіць беларускаму ўраду і органам дзяржаўнага кіравання прымаць адпаведныя рашэнні, а міжнароднай супольнасці — зразумець, куды рухаецца Беларусь і як яна дасягае сваіх Мэт устойлівага развіцця, заявіла **старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта Іна МЯДЗВЕДЗЕВА**.



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Нацыянальная платформа справаздачнасці па МУР запушчана ў канцы мінулага года і размешчана на сайце Белстата. Апроч іншага, платформа дапаможа ўцягнуць у працэс дасягнення МУР грамадзянскую супольнасць, лічыць **намеснік старшыні Белстата Алена КУХАРЭВІЧ.** Карыстальнік зможа камбінаваць розныя паказчыкі і размяшчаць іх у адной табліцы, выбіраць від дыяграмы, геаграфію, мэту, паказчык.

Намеснік старшыні статыстычнага ведамства таксама паведаміла, што платформа дазволіць вырашыць праблему разыходжання ў даных, атрыманых з розных крыніц, з данымі афіцыйнай статыстыкі: «Уся інфармацыя, якая датычыцца маніторынгу Мэт устойлівага развіцця, на глабальны ўзровень будзе давацца толькі Белстатам».

Сёння на платформе размешчаны 188 паказчыкаў, або 75 % ад тых, якія вызначаны актуальнымі для краіны, а таксама мэтавыя значэнні па 53 паказчыках. Гэта работа працягваецца.

Палову паказчыкаў Нацыянальнай платформы па фарміраванні справаздачнасці па Мэтах устойлівага развіцця дае статыстыка, астатнія — органы дзяржаўнага кіравання. Напрыклад, Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь забяспечвае інфармацыяй асноўныя паказчыкі Мэты 16 «Мір і правасуддзе».

**Намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік міліцыі грамадскай бяспекі, член Савета па ўстойлівым развіцці Мікалай МЕЛЬЧАНКА** расказаў удзельнікам форуму, як ведамства фарміруе пяць паказчыкаў названай Мэты.

Адна з асноўных крыніц інфармацыі — адзіны дзяржаўны банк даных пра правапарушэнні. Згодна з ёй за апошнія 10 гадоў колькасць ахвяр наўмысных забойстваў у нашай краіне знізілася ўдвая (да 240 у 2017 годзе і яшчэ на 6 % летась). За гэты ж час з 278 да 91 паменшылася і колькасць тых, хто загінуў у выніку гвалту ў сям'і. Найбольш дзейсный мерай у папярэджанні падобных трагедый МУС лічыць ахоўнае прадпісанне і прафілактычны ўлік. У 2018 годзе першае было выкарыстана ў адносінах да амаль сямі тысяч грамадзян, у тым ліку больш за шэсць тысяч былі абавязаны пакінуць агульнае з пацярпелымі жыллё.

Што датычыцца сексуальнага гвалту, то тут рэспубліканскі банк даных сведчыць пра рост. Намеснік міністра тлумачыць, што гэта звязана не столькі з тым, што такіх злачынстваў стала больш, колькі з тым, што раней ахвяры радзей паведамлялі пра такія злачынствы і сапраўдная іх колькасць была ў большай ступені схавана, чым цяпер.

Беларусі ўдалося дасягнуць зніжэння злачынстваў у сферы гандлю людзьмі, у тым ліку дзякуючы выкананню абавязацельстваў, якія прадугледжаны адпаведнымі міжнароднымі дагаворамі.

Сярод праблем, з якімі сутыкнулася міністэрства пры фарміраванні і маніторынгу паказчыкаў для Мэты 16, Мікалай Мельчанка назваў адсутнасць міжнароднай практыкі, крытэрыяў і метадалогіі для ацэнкі асобных паказчыкаў, цяжкасць адаптацыі міжнароднай метадалогіі да нацыянальных умоў, неабходнасць дадатковых абследаванняў і формаў уліку, якія патрабуюць фінансавых выдаткаў, і адсутнасць у нацыянальным заканадаўстве паняццяў «фізічны гвалт» і «псіхалагічны гвалт».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# УЗЯЦЬ ТАК, КАБ ПАКІНУЦЬ

***(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар. «МС».)***

«Развіццё па ўказаных кірунках пацягне змяненне эканамічнай геаграфіі Беларусі: значна вырастуць Мінск, Астравец, Гродна і Брэст, — падзяліўся прагнозамі палітолаг. — Чым больш моцнай становіцца эканоміка Беларусі, тым больш выгадна гэта для суседніх краін. Устойлівае развіццё на базе прынятай мадэлі — таксама найважнейшы фактар стрымлівання палітычнай напружанасці ва Усходняй Еўропе».

У найбліжэйшыя 10 гадоў сфарміруюцца ўмовы для таго, каб Беларусь стала ядром развіцця як мінімум для Усходняй Польшчы, Літвы і Латвіі, рэзюмаваў дакладчык.

## Дык што такое лічбавізацыя?

На гэта пытанне паспрабаваў адказаць **намеснік дырэктара адміністрацыі Парка высокіх тэхналогій Аляксандр МАРЦІНКЕВІЧ.**

«Гэта працэс аб'ектыўны, непазбежны, і яго спыніць немагчыма, — заявіў ён. — У нас ёсць рэальны свет і віртуальны свет, зараз адбываецца фарміраванне так званага гібрыднага свету, у якім першыя два светы паміж сабой зліваюцца. Эксперты ПВТ лічаць, што лічбавая эканоміка — гэта тая, якая будзе існаваць у гібрыдным свеце».

«Многія не разумеюць розніцы паміж лічбавізацыяй і інфарматызацыяй. Лічбавізацыя — гэта працэс, у выніку якога ствараюцца цалкам новыя прадукты, сэрвісы і цэлыя галіны. Калі мы пачынаем рабіць тое, чаго не рабілі да таго, як была ўкаранёная лічбавізацыя, або адмаўляемся ад таго, што рабілі традыцыйна», — тлумачыў дакладчык удзельнікам форуму.

Лічбавізацыя наступае тады, калі, скажам, кампанія Uber стварае платформу, якая цалкам змяняе ўсе бізнес-працэсы. Калі залішнімі становяцца аператары, а любы чалавек, які мае аўтамабіль, можа прапанаваць сваю паслугу на рынку.

У лічбавай эканоміцы зрушваюцца фокусы: сёння больш каштоўнымі становяцца ўласцівасці тавару, чым сам тавар. Напрыклад, кампанія Rolls-Royce прадае ўжо не рухавікі для самалётаў, а час палёту, а Liebherr прадае не грузавыя краны, а танаж. Калі мы сёння не будзем да гэтага гатовыя, нам не ўдасца пабудаваць канкурэнтаздольную эканоміку, падкрэсліў намеснік дырэктара адміністрацыі ПВТ.

Нарэшце, лічбавая эканоміка вядзе да росту пакупной здольнасці насельніцтва. «Справа ў тым, што сёння праграмнае забеспячэнне смартфона замяняе магнітафон, дыктафон, ліхтарык і шмат чаго яшчэ, — прывёў чарговы прыклад Аляксандр Марцінкеіч. — За кошт таго, што тавары становяцца лічбавыя, іх вельмі лёгка капіяваць, для гэтага не патрэбны матэрыяльныя рэсурсы. Да таго ж праз тое, што рэчаў шмат, змяншаецца іх кошт».

Для нашай краіны лічбавая трансфармацыя з'яўляецца рэальным і ўнікальным шанцам пераарыентаваць эканоміку, забяспечыць ёй устойлівы рост і павышэнне ўзроўню дабрабыту грамадзян, упэўнены прадстаўнік ПВТ.

«Мы сёння можам не толькі гандляваць сыравінай і таварамі, але і ствараць высокадаходныя інтэлектуальныя сістэмы і паспяхова канкурыраваць з вядучымі сусветнымі кампаніямі на міжнародным рынку», — падкрэсліў ён.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## А ШТО Ў РЭГІЁНАХ?

**Старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК:**



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

— 28 чэрвеня 2019 года ў Магілёўскай вобласці пройдзе першая рэгіянальная канферэнцыя па дасягненні Мэт устойлівага развіцця. Зараз вызначаны чатыры прыярытэтныя кірункі развіцця рэгіёна. Першае — умацаванне чалавечага патэнцыялу, забеспячэнне роўных магчымасцяў незалежна ад гендарнай прыкметы. Уцягненне ў развіццё рэгіёна ўсіх: бізнес-асяроддзя, грамадскіх аб'яднанняў, насельніцтва і мясцовай улады.

Гэта задача вельмі важная: за 10 гадоў насельніцтва вобласці знізілася на 29 тысяч чалавек. 13 раёнаў вобласці перажываюць наступствы катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, а гэта больш за 690 населеных пунктаў і 104 тысячы чалавек, або амаль 10 % насельніцтва вобласці. Тут мы актыўна выкарыстоўваем такі інструмент, як рэалізацыя мясцовых ініцыятыў пры падтрымцы замежных і міжнародных арганізацый і ўрадаў.

Другі прыярытэт — развіццё высокатэхналагічных і канкурэнтаздольных вытворчасцяў і паслуг, заснаваных на прынцыпах зялёнай эканомікі. Для гэтага актыўна выкарыстоўваецца інвестыцыйны і экспартны патэнцыял свабоднай эканамічнай зоны, прэферэнцыя для стварэння новых прадпрыемстваў у сямі рэгіёнах паўднёвага ўсходу вобласці.

Трэці прыярытэт — удасканаленне бізнес-асяроддзя, арыентаванае на эканоміку інтэлекту, сацыяльныя інавацыі і экалагічную бяспеку для павышэння занятасці і самазанятасці насельніцтва.

Чацвёрты прыярытэт — захаванне добрага навакольнага асяроддзя для забеспячэння найлепшай якасці жыцця для цяперашняга і будучага пакаленняў.

Наступныя крокі — больш шырокае прыцягненне вучоных, бізнесменаў і моладзі ў дасягненне Мэт устойлівага развіцця.

## МАЛАДЗЁЖНЫ ФАРМАТ

# СУПЕРГЕРОІ ДЛЯ СУПЕРМЭТ

**Падчас форуму ўзнагародзілі найлепшых юнакоў і дзяўчат у двух конкурсах. 17 з іх было прысвоена званне «Маладзёжны пасол Мэт устойлівага развіцця». А траіх адзначылі як пераможцаў у конкурсе коміксаў «Супергероі для супермэт».**

Каб атрымаць званне пасла, маладыя людзі прайшлі некалькі этапаў. На першым неабходна было абраць адну з МУР, якую яны хочуць прадстаўляць, і апублікаваць свой матывацыйны пост ва «УКантакце», «Фэйсбуку» ці «Інстаграме». Журы ацаніла каля 250 такіх заявак і адабрала ўдзельнікаў фіналу, які прайшоў у студзені. У ім 32 канкурсанты прэзентавалі ўласныя праекты і праграмы па дасягненні адной з МУР. Сярод іх былі ідэі па стварэнні музея экалогіі і тэхнагенных катастроф, павышэнні фінансавай адукаванасці падлеткаў і іншыя.

Конкурс коміксаў «Супергероі для супермэт» праводзіўся летась з 24 верасня да 20 лістапада. Удзельнікам неабходна было прыдумаць свайго супергероя або супергераіню, расказаць, як яны маглі б дапамагчы Беларусі ў дасягненні Мэт устойлівага развіцця. У конкурсе ўдзельнічалі хлопцы і дзяўчаты ад 12 да 22 гадоў.

Трэцяе месца заняла **Рэната СІВАКОВА** з вёскі Паташня Мёрскага раёна, вучаніца Павяцкай яслі-сад — сярэдняй школы. Яна намалявала комікс з Місіс МУР, якая змагаецца з бруднай вадой.

Другая прыступка п'едэстала засталася за **Максімам МАРОЗАВЫМ, студэнтам факультэта мастацтваў і дызайну Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы.** Яго герой — Алесь Журка, у якога ёсць ідэі, як нашай краіне дасягнуць адразу некалькіх Мэт устойлівага развіцця.



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Пераможцай стала **Ганна КАВЕЦКАЯ, вучаніца сталічнай сярэдняй школы № 201.** Яна стварыла МУРавіка — гэта дух Беларусі, які сцеражэ прыроду. Ён вучыць дзяцей ачышчаць ваду, берагчы рэсурсы, разам вырашаць праблемы экалогіі, піша кнігі пра беларускую прыроду. МУРавік знаходзіць новыя, бяспечныя для навакольнага асяроддзя крыніцы энергіі. А дапамагаюць яму духі прыроды.

**Надзея АНІСОВІЧ.**